# 14 верасня адкрыецца кангрэс «500 гадоў беларускага кнігадрукавання»

---

- 09.09.2017
- **Аўтар:** Сяргей Шычко
- **Культура**

**14 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі распачне сваю работу міжнародны кангрэс «500 гадоў беларускага кнігадрукавання».**

---



Падзея досыць значная, паколькі для ўдзелу ў кангрэсе збяруцца навукоўцы, грамадскія дзеячы, культуролагі з розных краін свету, каб ушанаваць і Францыска Скарыну, і плён яго працы, і паразважаць пра ролю здзяйсненняў беларускага першадрукара і асветніка ў развіцці кнігавыдання ва Усходняй Еўропе, ды іншых абсягах.

Арганізатары кангрэса — Міністэрства культуры і Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Суарганізатары — Цэнтральна-Еўрапейская Ініцыятыва (CEI), Бібліятэчная асамблея Еўразіі (БАЕ), Міждзяржаўны фонд гуманітарнага

супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. Мяркуецца, што ўсяго ў такім прадстаўнічым форуме прыме ўдзел звыш 600 навукоўцаў з 24 краін свету. У гэты ж дзень пройдуць і ўрачыстасці, звязаныя з 95-годдзем з дня заснавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Будзе адкрыта міжнародная выстаўка «Францыск Скарына і яго эпоха». Час, эпоха беларускага асветніка і першадрукара працягваюцца. А год 500-годдзя, год Францыска Скарыны некаторым чынам падсумоўваецца.

**Сяргей Шычко**